# Шляхі пад знакам блізнятаў




ота Віталія Гіля, "МВ"

***«Як дзве кроплі вады», — кажуць пра блізнят Гражыну і Агнешку Жолік. Выпускніцы ГрДМУ сёлета прымалі ўдзел у Рэспубліканскім балі выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі. Ды гэта не проста кроплі. Дыяманты! Імі ганарацца ўсе, хто іх ведае. Выдатніцы лячэбнага факультэта, актывісткі і ў той жа час вельмі сціплыя абаяльныя дзяўчаты.***

Гражына і Агнешка прыйшлі на сустрэчу ў родны медуніверсітэт. Тут, на Дошцы гонару, — іх партрэты, так што мы адразу пазналі прыгажунь, што спяшалі насустрач…

Нарадзіліся дзяўчынкі–блізняты ў вёсцы Лычкаўцы Шчучынскага раёна: Агнешка на 10 хвілін раней за Гражыну. Паспяхова скончылі Галавічпольскую сярэднюю школу і адразу паступілі на лячэбны факультэт ГрДМУ. Гражына набрала тады 370 балаў — найбольшую колькасць сярод абітурыентаў. Агнешка таксама паспяхова прайшла тэсціраванне, паступіла разам з сястрой.

*— Радаваліся не толькі мы з Агнешкай, але і тата з мамай, нашы бабулі і дзядуля, якія вельмі хацелі, каб мы сталі дактарамі,* — гаворыць Гражына. *— Вучыліся з вялікай ахвотаю. Актыўна займаліся навуковай дзейнасцю.*

У Агнешкі — 40 навуковых публікацый. Выступала з дакладамі на міжнародных медыцынскіх форумах, што праходзілі ў Варшаве, Беластоку, Кракаве, Чарнаўцах…

Репозиторий ГрГМУ

Гражына — стыпендыят Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. У яе — 37 навуковых публікацый. У складзе каманды ўніверсітэта заняла 2-е месца на рэспубліканскай алімпіядзе па акушэрстве і гінекалогіі.

*— Увесь час былі з Гражынай у адной групе, а потым, калі выбралі кожная сваю спецыяльнасць, разышліся па розных шляхах,* — кажа  Агнешка. *— Я спынілася на отарыналарынгалогіі, буду працаваць па гэтай спецыяльнасці ў Гродзенскай гарадской паліклініцы № 6 .*

*— А мяне размеркавалі ў Мінск урачом-акушэрам-гінеколагам у 6-ю гарадскую клінічную бальніцу,* — дадае Гражына. *— З першага  жніўня будзем праходзіць інтэрнатуру: я — у Гродзенскім клінічным абласным перынатальным цэнтры, Агнешка — ва Універсітэцкай клініцы Гродна.*

Успомнілі дзяўчаты і сваіх выкладчыкаў.

*— Вельмі ўдзячная сваім настаўнікам-практыкам: загадчыку кафедры отарыналарынгалогіі ГрДМУ доктару мед. навук, прафесару Алегу Генрыхавічу і ўрачу-отарыналарынголагу Універсітэцкай клінікі Генрыху Алегавічу Хоравым. Алег Генрыхавіч не толькі дапамагае мне спасцігаць гэты цікавы накірунак медыцыны, але і дае слушныя жыццёвыя парады,*— прызнаецца Агнешка.*— Прыслухоўваюся і прыглядаюся да кожнага прафесіянала, які тут працуе, каб стаць майстрам сваёй справы.  Дапамагаюць у практычнай медыцыне тэарэтычныя веды і навуковая дзейнасць з універсітэцкіх часоў. Сёлета я ўдзельнічала ў анлайн-секцыі 6-га Букавінскага міжнароднага медыка-фармацэўтычнага кангрэса студэнтаў  і маладых вучоных з дакладам «Аналіз лячэння флегмон шыі», дзе заняла 2-е месца, а пасля была асістэнтам на аперацыі ў Алега Генрыхавіча. Чым больш працую, тым больш мне хочацца ведаць.*

У Гражыны — свае настаўнікі.

*— Мае прызнанне і ўдзячнасць — дэкану факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі дацэнту Андрэю  Плоцкаму, дэкану педыятрычнага факультэта дацэнту Андрэю Гурыну, дацэнту кафедры акушэрства і гінекалогіі ГрДМУ Алене Саваневіч, асістэнту гэтай кафедры кандыдату мед. навук Наталлі Смалей,* — пералічвае дзяўчына. *—  Гэтыя людзі прывялі мяне ў прафесію, якая захапіла. Я ўжо асісціравала на аперацыях, на кесаравым сячэнні — засталіся незабыўныя эмоцыі.*

Мы з Агнешкай цвёрда вырашылі: займацца не толькі практычнай медыцынай, але і навукай, каб потым паступіць у аспірантуру. Сапраўдны доктар павінен вучыцца ўвесь час.

Выдатна, што ў нашым універсітэце створаны ўсе ўмовы для развіцця асобы.

Вольнага часу ў блізнят не так багата, але калі ён выпадае, Агнешка і Гражына едуць у родныя мясціны, каб наведаць сваякоў, дапамагчы па гаспадарцы.

*— Захапляемся падарожжамі. З задавальненнем слухаем музыку, чытаем,* — гаворыць Агнешка. *— Але ж і тут аддаём перавагу навуковай літаратуры.*

*— А песні стараемся слухаць пераважна з англійскім тэкстам, каб больш дасканала засвоіць мову,* — дадае Гражына.

Рэпазіторый ГрГМУ

А яшчэ дзяўчаты захапляюцца футболам, ды і самі не супраць пагуляць. На кухні таксама разам.

*— Любім гатаваць мяса па-французску,* — кажа Гражына.

*— І смажыць бульбу па-беларуску,* — з усмешкай удакладняе Агнешка.

Светлана Хорсун

Репозиторий ГрГМУ